**Т.М. Ігнацюк**
Брэст, БрДТУ

# КАТЭГОРЫЯ ПАЗІЦЫЯНІРАВАННЯ І ПАФАС МАЎЛЕННЯ

1.1. Пафас маўлення на сённяшні дзень не даследаваны не толькі ў беларускай, але і ў замежнай лінгвістыцы. Шматлікія падручнікі па рыторыцы змяшчаюць надзвычай лаканічныя і не разгорнутыя яго азначэнні, спасылаючыся на антычныя традыцыі. Між тым, пафас выступае фундаментальным і неад'емным складальнікам дыскурсу – разважлівага маўлення, у якім халодная бясстрасная аргументацыя мяжуецца з эмацыянальным запалам прамоўцы. Трансляцыя пануючай у грамадстве ідэалогіі і маўленчая экспрэсія не абыходзяцца без таго, што ў рыторыцы называюць пафасам.

Гіпатэтычна можна дапусціць, што сучаснай беларускай літаратурнай мове з яе гаваркім сакавітым словам, якое жывіцца з крыніц народнай культуры, пафас не ўласцівы. У гаворцы запатрабавана этыка слова. Аднак адмаўляць пафас мовы – значыць адмаўляць яе сувязь з ідэалогіяй і яе дзейснасную (энергетычную) сутнасць. У розныя перыяды гісторыі ў рознай ступені жыццё непазбежна падвяргаецца ідэалагізацыі, што не можа не адлюстравацца на мове. Таму даследаванне маўленчага пафасу знаходзіцца ў рэчышчы фундаментальнай праблемы сувязі мовы і ідэалогіі.

У сучасным свеце з яго прагрэсіруючай глабалізацыяй сувязі нацыянальнай ідэалогіі з мовай становяцца больш цеснымі. Мова ўсведамляецца як дзейсны ідэалагічны інстытут – «дом быцця» (М. Хайдэгер).

1.2. Ідэя супрацьпастаўлення пафасу і этасу здольна стаць, на нашу думку, пачатковым пунктам даследавання пафасу ў маўленні. Пафас кантрастуе з этасам, успрымаецца на яго фоне. Кантраст этасу і пафасу – гэта антытэза звычайнага і незвычайнага, рэальнага і ўстаноўленага (намінальнага), звычаю і закона.

Найбольш яскрава этычна-пафасная антытэза праяўляецца ў публіцыстыцы. Публіцыстыку немагчыма ўявіць сабе без пабуджальнага пачатку. У газетных тэкстах прысутнічае імкненне ўзбудзіць інтарэс і заклікаць чытача, стварыць шырокі рэзананс якой-небудзь падзеі. Адбываецца ідэалагізацыя жыцця, ствараецца ідэалагізаваная ўзнёслая мова. Наўрад ці звычайны селянін на пытанне, што ён рабіў у полі ад цямна да цямна, скажа: «*Ад зоркі да зоркі знаходзіўся на пярэднім краі барацьбы за ўраджай*». Аднак за яго так скажуць ідыёлагі, якія ствараюць «агнявую» лексіку і фразеалогію для падтрымання ў народа рэвалюцыйнага баявога духу.

Не проста *збор уражаю*, але *бітва за ўраджай*; не проста *жыць мірна*, але *змагацца за мір*. Пафас спрыяе развіццю ўзнёслай энергетычна насычанай лексікі і фразеалогіі. Пафас не абыходзіцца без такой фігуры маўлення, як перыфраза: не *салдат*, а *воін*, не *ўніверсітэт*, а *альма матар, храм навукі*; не *вярблюд*, а *карабель пустыні*, не *нафта*, а *чорнае золата* і г.д. Гэты «вечны бой» ваяўнічага пафасу кантрастуе са звычайным адчуваннем звычайнага чалавека, якое выражаецца ў народным выслоўі *«абы ціха, абы вайны не было»*.

Адзначым, што тэхналогія ўтварэння пафасных адзінак маўлення напамінае біржавыя спекуляцыі: спекуляцыя на павышэнне (*не дом, а палац*) і спекуляцыю на паніжэнне (*віно – слёзы Мічурына*). Акцыі каго-чаго-небудзь «падаюць» ці «падымаюцца» ў залежнасці ад наймення.

Пафас таксама ўласцівы намінатыўным адзінкам мовы – назвам і імёнам. *«Як тваё імя, якога роду ты? Хто наканаваў табе твой шлях? Таямніц якіх словаў няпростых, Адшукаць хацеў у гэтых краях?»* (С. Осіпаў, А. Усціновіч). Пытанне «*якога роду ты?»* прадугледжвае этычную назву. Сутнасць назвы дэскрыптыўная. Рэферэнтам назвы выступае аб'ект (індывід). Назва-дэскрыптыў – гэта м е т к а. Меціцца тое, што актуальна («тут і зараз») кідаецца ў вочы. Канкрэтная лексіка, якая называе рэаліі, уся дэскрыптыўная.

Дэнатат імені – суб'ект, які пазіцыяніруе сябе ў ідэалагічным прававым полі. Імя – катэгорыя юрыдычная. Так, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе нам «право на жизнь, достойные условия жизни и охрану здоровья, образование и труд, отдых и досуг, на свободу личности и защиту, на имя и гражданство, материальное обеспечение» (арт. 43).

Імя ідэнтыфікуе суб'екта права – як тоесную сабе асобу, за якой стаіць «*Я*» (*Я, Іван Пятровіч),* і як асобу, якая атаясамляе сябе з сацыяльна легітыўным калектывам (*доктар, настаўнік, журналіст* і да т.п.). Сацыяльнае атаясамленне выражаецца камітатыўным (сумесным) займеннікам «Мы»: («*Ну, от і ідзі ў еты свій рай! А мы, нібыто, так пажывем! Нам і так непагано!*» [1, с. 22]). Гэта ўсё імёны – уласныя і агульныя.

Асоба павінна па праву насіць пэўнае імя. Права на імя – філасофская праблема: «*Паслухай, ты – шэпт Хрысці перарывісты. – У майго сына ёсць імя, прозвішча і імя па бацьку. Ён – Хведар Хведаравіч Жытнік. Разумееш? Мой муж, Хведар Жытнік, які загінуў на фронце, наказаў даць гэтаму дзіцяці сваё прозвішча і імя... І я нікому! Разумееш? Нікому! Нават табе не дазволю*! » [2, с. 213].

У этычным неідэалагізаванным полі культуры правіць звычай, апора на традыцыю («Так прынята»). Культура сама па сабе статычная: «Як ёсць, так ёсць», «не намі заведзена», г.зн. паводле звычаю, эвалюцыйна. Культура – узровень статычнага факта, фактаграфіі, росту і прыросту. У інфармацыйнае поле культуры трапляюць толькі дэскрыпцыі (такія словы, як: *заяц, воўк* і інш.). Дэскрыпцыі – рэальныя («па прыродзе»).

Ідэалогія дынамічная. Замест культурных акцый у іэалагічным полі адбываюцца дынамічныя акты – падзеі. Падзеі звязаны не з ростам, а з развіццём – пераменай стану. Ідэалогія – узровень імені. У ідэалагічным полі зыходзяць з дынамічнай устаноўкі «як мусіць быць». Менавіта таму ў імені няма рэчыўнасці, аднак увасоблена дынамічная стэрыатыпная ідэя.

Нараджэнне дзіцяці – факт, які сведчыцца метрыкай (пасведчаннем аб нараджэнні). Наданне яму імені – імяніны – гэта ўжо падзея. Імя не пасведчанне індывіда (аб'екта), а засведчанне асобы. Падзея суправаджаецца пафасам. Факты – прыналежнасць этасу.

Пафас уласнага імені ўжо ў тым, што носьбіт імені фігуруе як прававая асоба. Імя ўздымае яго на вышыню сацыяльнага быцця. «"*Як жа жывем, Аўдоцця Пятроўна?" – пацікавіўся звонка, прыязна Башлыкоў. Імя па бацьку старой выпытаў ціха у сына. – "Да як? Жывём."*» [3, с. 34]. «*Руды падышоў апошні, паздароўкаўся... Ціснуўшы руку, павіншаваў: "Са шчаслівым вазврашчэннем, Міканор Дамецевіч!"*» [4, с. 136].

Запатрабаваннем пафаснага-ідэалагічнага гучання выкліканы да жыцця шматлікія ўласныя імёны, якія выкарыстоўваліся ў свой час у моўнай практыцы: *Кім* (Камуністычны інтэрнацыянал), *Рэм* (Рэвалюцыя міравая), *Акцябрына* (народжаная Акцябром) і да т.п. Безумоўна, «гучанне» з'яўляецца прычынай распаўсюджання такіх прозвішчаў, як *Гром, Громаў, Грамыка* і пад. «У вёсцы Старыя Грамыкі (Гомельшчына) амаль усе жыхары мелі прозвішча Грамыка. У суседніх Новых Грамыках, дзе больш

за 200 двароў, таксама ўсе жыхары з прозвішчам Грамыка». Параўн.: *Сталіна, Турбіна, Рэўдзіт* (рэвалюцыйнае дзіцё), *Авангард, Электрон* і да т.п. *Кінамеханік тут фігура! Самі пабачыце. А як яго імя, ніколі не здагадаецеся: Молат. Праўда, Молат Дзмітрыевіч. Самае індустрыяльнае імя ўляпілі бацькі на ўсё жыццё* (Грахоўскі).

1.3. Акрамя публіцыстыкі, пафас прысутнічае ў мастацкіх творах, прысвечаных так званым «пераломным» момантам гісторыі. У пэўныя гістарычныя перыяды мова, а значыць і створанае на ёй славеснае мастацтва – літаратура – падвяргаюцца ідэалагізацыі, становяцца рупарам ідэй пануючага класа. Разам з ідэямі (рэвалюцыйнымі, патрыятычнымі і г.д.) у мастацтва прыходзіць неад’емны складальнік ідэалогіі – пафас. Пафас выступае фундаментальным і неад’емным складальнікам дыскурсу – разважлівага маўлення, у якім халодная бястрасная аргументацыя мяжуецца з эмацыянальным запалам прамоўцы. Транляцыя пануючай ў грамадстве ідэалогіі і маўленчая экспрэсія не абыходзіцца без таго, што ў рыторыцы называюць пафасам.

У жыцці адбываюцца знакавыя падзеі, звязаныя з карэннымі грамадскімі пераўтварэннямі. У розныя перыяды гісторыя ў рознай ступені жыццё непазбежна падвяргаецца ідэалагізацыі, што не можа не адлюстравацца ў мове. Ідэалагізацыя слова адбываецца па меры ідэалагізацыі жыцця. У часы рэвалюцыйных пераўтварэнняў антытэза «паэт і грамадзянін» губляе выразныя контуры. Паэт займае актыўную грамадзянскую пазіцыю, становіцца трыбунам, і яго творы набываюць пафаснае гучанне. Так, заклікам да барацьбы з ворагам гучаць радкі верша Янкі Купалы «Беларускім партызанам!»: *Партызаны, партызаны, Беларускія сыны! За няволю, за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны.* Таму даследаванне маўленчага пафасу знаходзіцца ў рэчышчы фундаментальнай праблемы сувязі мовы і ідэалогіі.

У новай рэальнасці прысутнічаюць адзінкі, якія маюць сацыяльны статус. Нараканне – рэвалюцыйны акт свабоды і станаўлення чалавека як аўтаномнай асобы. Гэты акт звязаны з катэгорыяй імені і інстытуцыяналізацыяй (устанаўленнем) сацыяльнай рэальнасці. У гэтай рэальнасці нічога не нараджаеццацца і не вырастае – толькі ўстанаўліваецца і развіваецца. Галоўным складальнікам адзначанай рэальнасці выступае пэўны сацыяльны інстытут. Сацыяльная рэальнасць характарызуецца дынамічнасцю развіцця. У ёй адбываюцца падзеі, рэалізуюцца ідэі і сацыяльныя праекты. Інстытуцыяналізацыя – пераход ад стыхійнай, спантаннай (неарганізаванай) дзейнасці да ўстанаўлення арганізацыйных структур, якія рэгламентуюць сацыяльную дзейнасць і арганізуюць сацыяльныя стасункі.

*Homo institutius* (чалавек інстытуцыянальны) – асоба, якая маніфестуе сябе праз «Я». Той ёсць «Я», хто вымаўляе «Я». «Я» – самы лаканічны

маўленчы акт дэкларацыі ўласнай тоеснасці і пазіцыянавання чалавекам сябе як незалежнай асобы. Адначасова гэта і маніфестацыя ўласнай свабоды ад жыццёвых арганічна-рэчыўных акалічнасцей, – «майго», «роднага», «матчынага». У «Я» ўвасоблены пафасны патэнцыял, здольны з неабходнасцю рэалізавацца ў дыскурсіўным маўленні. За «Я» стаіць імя ўласнае, якое падымае чалавека на ўзровень грамадскага жыцця: «Да імені чалавек не ёсць яшчэ чалавек, ні для сябе, ні для другіх, не ёсць суб'ект асабовых адносін, значыць не ёсць член грамадства, а толькі магчымасць чалавека, абяцанне такога, зародак» [5, с. 62].

Аснову пафасу складае супярэчнасць, якая вынікае з ідэалагічнага пазіцыянавання: *мы – яны, наша не наша, пралетарскае – буржуазнае* і г.д. «*Варожыя сілы ўсіх масцей, – загаварыў ён [Башлыкоў] выразна, дужа, – дзейнічаюць шырокім фронтам. Яны дзейнічаюць у міжнародным масштабе і на ўнутраным фронце. Яны не грэбуюць нічым, каб падарваць нас. Яны шкодзяць нам і ў вялікіх, дзяржаўных справах, і ў малых. У любым сяле, у любым калгасе…*

*Класавы вораг дзейнічае. І мы таксама, – голас Башлыкова ўсё цвярдзеў, – будзем дзейнічаць! Мы будзем бязлітасна біць па ворагу і яго пасабніках! Дзе б яны не вылезлі!*» [4, с. 61].

«*Хлопец быў наш, – як бы білі Апейку словы шкадавання. Мы верылі яму. Спадзяваліся на яго як на камсамольца, таварышча!.. Ен не можа быць не нашым. Усё, што ў ім ёсць добрае, усё гэта наша. Ад савецкай улады…*» [3, с. 337]. Займеннік мы набывае пафаснае гучанне, увасабляе ідэю маналітнага адзінства. Узровень пафасу падымаецца ў сувязі з ідэалагічным напружаннем маўлення.

Дынамічныя пафасныя стэрэатыпы ўласцівы агентыўным імёнам. Іх пафасны патэнцыял праяўляецца як прадпісанне да актыўнай дзейнасці, заклік да барацьбы, вызвалення, паўстання, на сход: «*Вызваль дух* свой, *рабскі люд!*» (А. Гарун); «*Чуеш: Волі зычны звон / Будзіць, кліча меддзю ён /Усе народы ўсіх старон, / Каб разбурыць крыўды трон*» (А. Гарун); «*На сход, на ўсенародны, / Грозны, бурны сход / Ідзі, аграблены, закованы народ!... / Аддай на суд свае ўсе Крыўды, слёзы, кроў*» (Я. Купала); «*Паўстань, народ!... / З крыві і слез кліч гэты… / Цябе чакае маці-Беларусь!*» (Я. Купала); «*Паўстань, народ! / Прачніся, беларусе! / Зірні на Бацькаўшчыну, на сябе!*» (Я. Купала); «*Над зямлею паплыў новы, радасны кліч: / «Бедакі ўсяго свету, злучайцеся! / Распаляйце ў душы слова вольнага зніч; / Ад смяротнага сну абуджайцеся!*» (А. Дудар); «*Гары ж, агонь Кастрычніка, гары! / Свой промень зоркі раздувай. / Няхай ён ззяе з краю ў край! / Хто спіць да гэтае пары – Уставай!*» (Ц. Гартны).

Пачынаецца новы час, навальнічны час суровы, вялікі час магутнае стыхіі: «*Пачынаецца вялікі час магутнае стыхіі, / І б'ецца сілай хваль*

*вялікі акіян, / І рушыць ён і рве асновы ўсе старыя, / Дрыжыць прад сілай той і цемра і туман. / Дрыжыць, хістаецца, звяртаецца ў руіны / Стары закон, няпраўда, здзек, прыгон...»* (А. Гурло); *«Час вялікі настаў... / Загарэўся пажар... / Зазвінелі палацаўваконніцы... / Ўсход агнямі прабіў / Цяжкі мур чорных хмар, / заглянула к нам раніцы сонца»* (А. Дудар); *«Праскакаў над бяздоннем вякоў навальніцы чырвоны конь. Гэта іскры яго падкоў запалілістары закон»* (А. Дудар).

Шляхамі Рэвалюцыі ідзе і вёска, таму што змены ёй былі неабходны ў першую чаргу: *«Новы выгляд прыняў / Край балот і лясоў, / І здаецца мінуўшчына казкаю... / І не льецца ўжо больш / Кроў гаротных сыноў / Беларусі рабоча-сялянская...»* (А. Дудар); *«Цвіце красой савецкі край, / Няма больш вескі злой, / – Сталыпінска-прышчэпаўскай / Кулацка-хутарской!»* (Т. Кляшторны); *«Чую – там падымаецца лескат, / Разліваецца полем аўсяным, / Гэта звоніць кужэльная веска, / Да Кастрычніка туліцца ўся»* (П. Трус); *«Закапаная праз вякі магнатамі і кулакамі, парэзаная на шматкі раскрыўленнымі пазурамі, акропленая, як віном, суровым паднявольным потам...Яна чакала жаніха, што вызваліць і пабудзіць»* (А. Дудар). Слова «жаніх» набывае пафаснае гучанне, таму што тут маецца на ўвазе вызваленец-Акцябр, які выратуе вёску. *«Я мінуўшчыны не шкадую: / Не збіраць вёсцы ягады слёз... / Беларусь больш не стане крыжам / Пры дарозе з хрыстом распятым!»* (С. Дарожны).

Людзі знаходзяцца ў супярэчнасці паміж сваёй мізэрнасцю, нікчэмнасцю, і неабходнасцю таго, што ім патрэбна Рэвалюцыя: *«Мы – богі! / Убогія богі! / Дык кіньма хоць след! / Навука, гульня, канстытуцыя / І нават сама – Рэвалюцыя, / – Ўсё гэта патрэбна нам! / Не панам! / Мне! Браточкі, браточкі мае!»* (М. Грамыка).

Кастрычнік змяніў не толькі вёску, ён змяніў лёс ўсіх жыхароў горада, ўсёй краіны: *«Кастрычнік – зарніцай палыхнуў занядбалым усім. Што людзям не магло і прысніцца, – ён прынёс на штандары сваім»* (У. Дубоўка). Людзі адчуваюць сваю веліч, непераможнасць, магутнасць, таму што яны дзеці Рэвалюцыі і Акцябра сыны, а ў сэрцы гарыць чырвоны сцяг: *«Мы непераможны! / Глянь жа шырай, шырай. / Мы спаткаем сёння / Будучыні лёс»* (М. Хведаровіч); *«Перамогі слаўнай сцяг / Узнімаецца ў краіне. / Свет стары ў прадонні гіне. / І яснее і квітнее / Сонца новага жыцця»* (Я. Журба).

У творах з рэвалюцыйнай тэматыкай аснову пафасу складае супярэчнасць, якая вынікае з ідэалагічнага **пазіцыянавання**, гэта значыць знаходзіць водгук у спробе пабудаваць новае жыццё, у велічы яднання і перамог працоўных, іх галоўнага жадання – пакласці канец эксплуатацыі чалавека чалавекам.

Пафас выступае неабходным складальнікам маўлення, якое здзяйсняецца не «па прыродзе», а па «ўстанаўленні». Пафас прысутнічае не ў жывой, а ў штучна сканструяванай (інстытуцыянальнай) рэальнасці. Ён уваходзіць у супярэчнасці з этычнымі рэаліямі жыцця, з'яўляецца іх адмаўленнем. У гэтым сэнсе пафас знамянуе прагрэс, які адмаўляе сувязь з культурнай спадчынай продкаў. З поўным правам пафас можна назваць нацыянальным кампанентам беларускай мовы.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Мележ, І. Людзі на балоце : раман з «Палескай хронікі» / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 399 с.

2. Каліна, К. К. Маці і сын : аповесць, апавяданні / К. К. Каліна. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 275 с.

3. Мележ, І. Подых навальніцы : раман з «Палескай хронікі» / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 477 с.

4. Мележ, І. Завеі, снежань : раман з «Палескай хронікі» / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 239 с.

5. Флоренский, П. Имена / П. Флоренский // Малое собрание сочинений – Кострома : Купина, 1993. Вып. 1.